СЕКЦИЯ 3
# ИСТОРИОГРАФИЯ И ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЕ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И НАРОДОВ МИРА

УДК 930(476.6)"1795/1915"

## КРЫНІЦЫ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ САЦЫЯЛЬНАЙ ТАПАГРАФІІ г. ГРОДНА Ў 1795–1915 гг.

*Гацко Ягор Уладзіміравіч*
аспірант кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі « Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы », метадыст дзяржаўнай установы адукацыі «Гродзенскі абласны цэнтр турызму і краязнаўства»
(г. Гродна, Рэспубліка Беларусь)

*Артыкул прысвечаны агляду асноўных крыніц пры вывучэнні сацыяльнай тапаграфіі г. Гродна падчас уваходжання ў склад Расійскай імперыі (1795–1915 гг.). Крыніцы падзелены на апублікаваныя і неапублікаваныя. У першым тыпе аглядаецца айчынная літаратура, у другім – архіўныя дакументы.*

«Гарады прынеслі веліч невялікаму кантыненту», – заўважыў пра Еўропу Фернан Брадэль [2, с. 541]. Менавіта гарады, якія канцэнтруюць на абмежаваных плошчах значныя масы насельніцтва, стварылі новыя сацыяльныя сістэмы, якія не толькі падпарадкоўвалі тэрыторыі цэлых краін, але і сталі адным з каталізатараў сусветнага гістарычнага працэсу. Натуральна, працэсы генэзісу гарадоў, абставін іх узнікнення і развіцця выклікалі ўзмоцнены грамадскі і навуковы інтарэс [6, с. 7].

Горад валодае высокім патэнцыялам з пункту гледжання вывучэння яго прасторавых аспектаў. Асабліва калі ён мае шматвекавую гісторыю і захаваныя ансамблі гістарычных кварталаў, якія нібыта нябачнай ніццю злучаюць нас з гараджанамі мінулага. Да такіх гарадоў мы смела далучаем Гродна.

Мэта дадзенага артыкула: зрабіць невялікі агляд на замежныя і айчынныя крыніцы, вызначыць асноўныя крыніцы пры вывучэнні сацыятапаграфіі г. Гродна ў 1795–1915 гг., выдзеліць іх тыпы.

На сённяшні дзень у айчыннай гістарыяграфіі няма дакладнага вызначэння тэрміна «сацыяльная тапаграфія». Адным з першых на тэрыторыі былога СССР, хто канкрэтызаваў гэты тэрмін, быў савецкі і ўкраінскі даследчык Я. Дашкевіч. У 1987 г. ён вызначыў дадзенае паняцце як даследаванне ўрбанізацыйных працэсаў з пункту гледжання ўзаемасувязяў паміж сацыяльнай структурай насельніцтва і месцам яго пражывання. Іншая ўкраінская даследчыца М. Далінская вызначае сацыятапаграфію як міждысцыплінарны метад, які прадугледжвае прымяненне вынікаў даследавання сацыяльнай гісторыі на тапаграфічную аснову [15, с. 39]. Расійскія даследчыцы М. Рыгалава і Е. Бруханава разумелі гэты тэрмін як «уплыў сацыяльнай прыналежнасці, прафесіі, заняткаў, узаемаадносін розных сацыяльных груп на тэрытарыяльнае размяшчэнне» [10, с. 157].

Такім чынам, можна адзначыць, што сацыятапаграфія – гэта вывучэнне гарадской прасторы праз прызму дзейнасці чалавека.

Крыніцы пры вывучэнні дадзенай праблемы можна падзяліць на два тыпы: апублікаваныя і неапублікаваныя. Да першых мы адносім літаратуру (артыкулы і манаграфіі), а да другіх – архіўныя дакументы.

Вывучэнне сацыяльнай тапаграфіі г. Гродна пачалося адносна нядаўна – на мяжы 1990–2000-х гг. Дадзенай тэмай займаліся ў асноўным мясцовыя гісторыкі і даследчыкі. У 2002 г. выйшла польскамоўная манаграфія гродзенскага гісторыка Юрыя Гардзеева «Socjotopografia Grodna w XVIII wieku» [21]. Нягледзячы на назву, аўтар не абмяжоўваўся толькі XVIII стагоддзем. Ён раскрываў тапалагічную характарыстыку горада, яго палітычныя функцыі, уплыў войнаў і стыхійных бедстваў, апісваў гарадскую планіроўку, даследаваў тапаграфію забудовы і засяленне горада, культавыя аб'екты і могілкі, сацыяльную стратыграфію горада [21, s. 17–314].

Праз шэсць гадоў Ю. Гардзееў выдае беларускамоўны варыянт манаграфіі пад назвай «Магдэбургская Гародня» [5]. У ёй хоць і заяўлены перыяд XVI–XVIII стст., але сустракаецца пэўная інфармацыя і пра пачатак XIX ст. [5, с. 91, 103].

Што тычыцца артыкулаў, то можна адзначыць даследаванні Ю. Гардзеева, В. Саяпіна, Г. Семянчука, І. Соркінай, М. Супрона і І. Трусава [4; 16; 17; 18; 19; 20].

Што тычыцца архіўных крыніц, то мы вылучаем дакументы, якія захоўваюцца ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве ў г. Маскве (далей – РДВГА ў г. Маскве), Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў г. Санкт-Пецярбургу (далей – РДГА ў СПб), Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ у г. Мінску) і Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна).

У першых дзвюх расійскіх архіўных установах на дадзены момант намі знойдзены план Гродна за 1795 г. і планы асобных участкаў горада за 1875, 1877, 1882, 1885 гг. [8, л. 1; 3, л. 1–9].

У НГАБ у г. Мінску захоўваецца пэўная колькасць магістрацкіх актавых кніг за XVII–XVIII стст. З іх можна даведацца пра мяшчанскія пасэсіі, шляхецкія ўладанні, маёмасныя адносіны, а таксама імёны асобных гараджан-чальцоў цэхаў і гандляроў Гродна [1, арк. 1031, 1033, 1156, 1157, 1159, 1176, 1181, 1197]. У дакументах Слонімскай каралеўскай эканоміі можна прагледзець вайсковыя падраздзяленні і спіс квартыруючых расійскіх вайскоўцаў, якія ў 1796 г. размяшчаліся «в городе» і займалі будынак «На Городнице в академии» [7, арк. 3–24адв.].

Іншая рэспубліканская ўстанова – НГАБ у г. Гродна ўтрымлівае вельмі вялікую колькасць дакументаў у асноўным за перыяд існавання Гродзенскай губерніі (1801–1915 гг.).

З фонда № 24 намі былі вывучаны і апрацаваны некалькі рэвізскіх сказак (падушных перапісаў насельніцтваў) габрэяў за 1795 г. У іх змяшчаліся спісы гродзенскіх габрэйскіх сем'яў, дзе запісваліся імя і прозвішча ўладальніка, род заняткаў і ўзрост [11, арк. 2–30; 12, арк. 1–12адв.]. На жаль, пісар двух сказак не канкрэтызаваў месцажыхарства той ці іншай сям'і, а падзяліў на тых, хто жыў на правабярэжнай («в самом городе») і левабярэжнай («за Неманом») частцы, а таксама на «жыдоў неаседлых».

Справа № 18 гэтага фонда змяшчае сказку гродзенскай парафіі за той самы 1795 г. У ёй мы знойдзем спіс гараджан, якія жылі «пры суконнай фабрыцы», «у дамах мануфактурных за Нёманам», «пры скураной і карэтнай фабрыках» [14, арк. 1–7]. У дакуменце можна таксама знайсці інфармацыю пра святароў, служачых і жыхароў пры гродзенскіх каталіцкіх і ўніяцкіх храмах [14, арк. 8–13, 91адв.–92адв., 95, 106адв.–107адв., 111, 115].

Вызывае цікавасць і справа № 10, якая падпісана «Рэвізскія сказкі габрэяў г. Гродна за 1795 г.» [13]. Вывучаць яе дакументы трэба пільна і крытычна. Так, там ёсць апісанні габрэйскіх ўладанняў, але часта сустракаюцца і пляцы (зямельныя ўчасткі) хрысціян. Яшчэ ў тэксце ёсць згадкі аб прыналежнасці горада да Гродзенскай губерніі. Напрыклад, ёсць звестка пра мешчаніна Томаша Палудзінскага, які служыў «фротером в губернском доме» [13, арк. 6адв.–7]. Як вядома, Гродзенская губернія будзе створана толькі ў 1801 г. [9, с. 4]. Гэта наводзіць на думку, што дакумент быў створаны ў пач. XIX ст.

У тым самым архіве змяшчаюцца асобныя фонды гродзенскіх храмаў і кляштароў. Як правіла, там знаходзяцца шматлікія метрычныя дадзеныя аб нарадзіўшыхся, памерлых, тых, хто ўзяў шлюб, а таксама аб зямельна-маёмасных адносінах таго ці іншага культавага аб'екту.

Важнай крыніцай з'яўляюцца планы горада і планы асобных яго раёнаў. Яны сустракаюцца ў асноўным у фондах № 1, 8, 11, 125.

Пры вывучэнні сацыятапаграфіі г. Гродна ў 1795–1915 гг. мы карысталіся апублікаванымі і неапублікаванымі крыніцамі. Першыя былі прадстаўлены артыкуламі і манаграфіямі гродзенскіх даследчыкаў, а другія – архіўнымі крыніцамі ў РДВГА ў г. Маскве,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

РДГА ў СПб, НГАБ у г. Мінску і НГАБ у г. Гродна. Гэта актавыя магістрацкія кнігі, дакументы каралеўскай эканоміі, шматлікія рэвізскія сказкі, асобныя фонды гродзенскіх храмаў і планы як самаго горада, так і асобных яго частак.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Актавая кніга за 5 студзеня 1794 г. – 31 снежня 1795 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ у г. Мінску). – Ф. 1761. Воп. 1. Спр. 16. Арк. 1031, 1033, 1156, 1157, 1159, 1176, 1181, 1197.
2. Бродель, Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм в XVI–XVIII вв. / Ф. Бродель. – М. : Прогресс, 1986. – Т. 1. – 622 с.
3. Выкопировки из планов г. Гродно 1877–1910 гг. // Российский государственный исторический архив в СПб. – Ф. 1293. Оп. 166. Д. 4. Л. 1–9.
4. Гардзееў, Ю. Заўвагі да пытання часу заснавання яўрэйскіх занёманскіх могілак Гародні / Ю. Гардзееў // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 116–119.
5. Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гароднія / Ю. Гардзееў. – Гароднія-Wrocław : Гарадзенская бібліятэка, 2008. – 383 с.
6. Климовський, С. І. Соціальна топографія Києва XVI – середини XVII сторіччя / С. І. Климовський. – Київ : Стилос, 2002. – 230 с.
7. Перапіска з Гродзенскім гараднічым аб водпуску дроваў для ацяплення памяшканняў розных службовых асобаў за 1796 г. // НГАБ у г. Мінску. – Ф. 1885. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 3–24адв.
8. План г. Гродно 1795 г. // Российский государственный военно-исторический архив в г. Москве. – Ф. 846. Оп. 16. Д. 21871. Л. 1.
9. Радзюк. А. Рэвізская сказка Гродна пачатку XIX ст. / А. Радзюк, Ю. Гардзееў // Гарадзенскі гадавік. – 2024. – № 8. – С. 4–22.
10. Рыгалова, М. В. Историческая и социальная топография города: историографический обзор / М. В. Рыгалова, Е. А. Брюханова // Известия Алтайского государственного университета. – 2017. – № 5(97). – С. 156–160.
11. Рэвізскія сказкі габрэяў г. Гродна за 1795 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Ф. 24. Воп. 7. Спр. 3. Арк. 2–30.
12. Рэвізскія сказкі габрэяў г. Гродна за 1795 г. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 24. Воп. 7. Спр. 4. Арк. 1–12адв.
13. Рэвізскія сказкі габрэяў г. Гродна за 1795 г. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 24. Воп. 7. Спр. 10. Арк. 6адв.–7.
14. Рэвізскія сказкі гродзенскай парафіі за 1795 г. // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 24. Воп. 7. Спр. 18. Арк. 1–7, 8–13, 91адв.–92адв., 95, 106адв.–107адв., 111, 115.
15. Саєнко, Н. Соціальна топографія Батурина другої половини XVIII ст. (за матеріалами Рум'янцевського опису) / Н. Саєнко // Сіверянській литопіс. – 2017. – № 6. – С. 39–47.
16. Саяпін, В. Гісторыя вуліц Гродна ў XX стагоддзі / В. Саяпін // Гарадзенскі гадавік. – 2013. – № 2. – С. 60–91.
17. Семянчук, Г. Вуліцы Гродна часоў Расейскай імперыі (1795–1915 гг.) / Г. Семянчук // Гарадзенскі гадавік. – 2013. – № 2. – С. 48–59.
18. Соркіна, І. В. Сацыяльная тапаграфія Параднай (Саборнай) плошчы ў канцы XIX – пачатку XX ст. / І. В. Соркіна // Гарадзенскі гадавік. – 2012. – № 1. – С. 50–65.
19. Супрон, М. Новыя крыніцы па гісторыі гродзенскіх могілак у XIX – пачатку XX стст. / М. Супрон // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 24–31.
20. Трусаў, І. Заўвагі аб некаторых урбанонімах Гродна / І. Трусаў // Гарадзенскі гадавік. – 2013. – № 2. – С. 6–12.
21. Gordziejew, J. Socjotopografia Grodna w XVIII wieku / J. Gordziejew. – Torun : Wydawnictwo Adam Marszałek, 2002. – 341 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова